# Наваградскі КУР'ЕР

№ 1, 1991 г.



БГАКП ЦНЦ "Мемориал"

## У НУМАРЫ:


**Афіцыйны аддзел** «На шляху станаўлення» **У. Бармута.** — 2

**Паштовая скрынка «Кур'ера»** «Эксплуатацыя ці свабода?» **Я. Война.** — 3
«Цвёрдая рука» **В. Уладзіміраў.**

**Паэтычная гасцёўня.** Вершы С. Сянкевіча і Б. Абрыцкага. — 4

**Расейска-беларускі слоўнік** — 4

**Спадчына** «...Чынім правы вольныя» **М. Мікалаеў.** — 5

**Нядаўняя мінуўшчына.** «Паэт і КДБ, або Як я паліў свае вершы». **А. Пяткевіч.** — 6-7

**Лёсы людскія** «Эмігрант» **У. Сіўко.** — 8

**Вера.** «...Дом мой Домам Малітвы назавецца» **Юрась Гацкі.** — 9-11

**Навэла.** «Перад даждджом». **Міхась Талочка.**

**Навагрудак у старых паштоўках** — 13

**Гудзевіцкая народная медыцына** — 14

**Гумарэска** «Паразумеліся» **Алесь Муха.** — 16

**Беларусы жартуюць** (гумар, жарты, показкі). — 16




# НА ШЛЯХУ СТАНАЎЛЕННЯ

**Прайшло крыху больш года з дня заснавання раённай арганізацыі Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Тэрмін параўнальна непрацяглы. Але коратка спынюся на тым, што зроблена і што плануецца.**

### КРЫХУ ГІСТОРЫІ

25 жніўня 1989 года пад час нарады настаўнікаў раёна была ўнесена прапанова аб стварэнні аргкамітэта ТБМ імя Францішка Скарыны. За некалькі тыдняў аргкамітэт быў сфарміраваны. 13 кастрычніка адбылося ягонае пасяджэнне, абраны старшыня. Пачалася падрыхтоўка да раённай устаноўчай канферэнцыі.

28 лістапада прайшла канферэнцыя. Яна абрала раду Таварыства (25 чалавек), яе прэзідыум (5 чалавек) і рэвізійную камісію (5 чалавек). Паводле Статута кіраўніцтва ТБМ выконвае свае абавязкі на грамадскіх асновах. Пачаўся нялёгкі шлях станаўлення гэтай грамадскай арганізацыі.

23 сакавіка 1990 года яна зарэгістравана сакратарыятам рэспубліканскай рады Таварыства і, такім чынам, набыла афіцыйны статус.

На сёння зарэгістравана 15 першасных суполак, у якіх налічваецца каля 600 сяброў. Раённая арганізацыя набыла правы юрыдычнай асобы, мае сваю пячатку і рахунак у Навагрудскім аддзяленні Аграпрамбанка.

Нумар нашага рахунка 000700042. Кожны грамадзянін, арганізацыя, ўстанова маюць законнае права пералічваць на рахунак грашовыя сродкі. Дарэчы, некаторыя гэтае права выкарысталі. Шчырае дзякуй нашым ахвеаравальнікам. Вашы грошы будуць выкарыстаны на высакародную справу адраджэння беларускай мовы.

### НАБЫТКІ І ЗАДАЧЫ

Галоўным напрамкам работы Таварыства да прыняцця Закона аб мовах была падтрымка руху за вяртанне беларускай мове статуса дзяржаўнай. Прынятая на ўстаноўчай канферэнцыя адпаведная рэзалюцыя была накіравана ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР. Па нашай прапанове аналагічныя рэзалюцыі былі накіраваны туды ж ад некаторых першасных суполак.

Цяпер жа, пасля прыняцця Закона, наша задача — сумесна з усімі грамадскімі і палітычнымі арганізацыямі садзейнічаць яго выкананню.

Распрацаваны адпаведныя мерапрыемствы. Іх праект апублікаваны ў раённай газеце за 25 кастрычніка 1990 года.

Прадугледжваюцца два асноўныя напрамкі работы. Гэта павышэнне ролі ўсіх навучальна-выхаваўчых і культурна-асветніцкіх устаноў у пашырэнні сферы выкарыстання беларускай мовы. (У прыватнасці, да 2000 года прывесці ў адпаведнасць з нацыянальным складам насельніцтва колькасць вучняў агульнаадукацыйных школ, якія вучацца на беларускай мове). І другое — выкарыстанне як мага шырэй беларускай мовы ва ўсіх сферах жыцця. Да 1993 года ўвесці беларускую мову ў якасці службовай у практычную дзейнасць прадпрыемстваў, устаноў і арганізацый незалежна ад іх ведамаснай падпарадкаванасці.

Сёння ў гарадскіх дзіцячых садках адкрыты першыя беларускамоўныя групы, а садок № 7 цалкам пераведзены на беларускую мову. У СШ №№ 2, 4, 5, 6 і школе-інтэрнаце адкрыты беларускамоўныя класы, афармляюцца ў нацыянальным стылі кабінеты. У наступным годзе плануецца СШ № 4 цалкам перавесці на беларускую мову навучання і выхавання. Адчынены курсы па вывучэнню беларускай мовы на швейнай фабрыцы — для ІТР, у СШ № 4 — для выхавацеляў дзіцячых садкоў. У СШ № 5 плануецца адчыніць такія ж курсы для службовых асоб.

### НАША ВЫДАННЕ

Болей шырока будуць прапагандавацца пытанні адраджэння мовы, нацыянальнай самасвядомасці на старонках нашага бюлетэня «Навагрудскі кур'ер». Яго з'яўленне — добрая праява перабудовачнага часу. Якім жа атрымаўся першы нумар, — меркаваць чытачам. На маю думку, ён занадта палітызаваны. Праблемы і задачы Таварыства апынуліся недзе на заднім плане. На першым — праблемы грамадска-палітычнага жыцця. Хаця, вядома, ад іх мы не можам таксама адгарадзіцца, бо надта звузім кола чытачоў. Выданне стане больш цікавым, калі будзе шырэйшым кола чытачоў і аўтараў. Чакаем вашых публіцыстычных і мастацкіх твораў, прапаноў, заўваг.

### СЯБРОЎСКІЯ ПАСВЕДЧАННІ І ЗНАЧКІ

З 1991 года пачынаецца ўручэннем сябрам Таварыства пасведчанняў і значкоў. Каб іх атрымаць, сябры арганізацыі ўносяць на рахунак ТБМ у памерах, вызначаных Статутам, уступныя і гадавы складкі (узносы). Яны афармляюцца праз скарбовыя лісты. Пасведчанні і значкі выдаюцца тым, чые прозвішчы пазначаны ў лістах. Уступная складка (1 рубель) як раз і пойдзе на аплату значка і білета. Астатнія грошы будуць выдаткаваны на выданне «Навагрудскага кур'ера», заахвочванне тых, хто прыме актыўны ўдзел у арганізацыі курсаў па вывучэнню беларускай мовы.

**У. БАРМУТА,**
**старшыня раённай рады ТБМ імя Францішка Скарыны.**





## ЭКСПЛУАТАЦЫЯ ЦІ СВАБОДА?

**У СВЯДОМАСЦІ савецкіх людзей укараніўся міф, быццам бы ў нас няма эксплуатацыі. Ці так гэта? Возьмем хаця б статыстыку. Адна гадзіна працы ў Швецыі, ФРГ каштуе 28-30 доляраў, у СССР — менш аднаго. Амерыканскі рабочы атрымлівае ў пераліку на рублі 8—9 тысяч у месяц, гэта прыкладна ў 30 разоў болей за савецкага. Рабочым Захада вяртаецца 70 працэнтаў працы, у нас — не больш 20.**

**Якая ж нагода такога становішча? Іх шмат. Але пры роздуме над гэтымі лічбамі прыходзяць на ўспамін словы К. Маркса пра тое, што бюракратыя здольна ператварыць усю дзяржаву ў сваю прыватную ўласнасць, стварыўшы лад дзяржаўнага капіталізму. Бюракраты — гэта калектыўныя эксплуататары, калектыўныя капіталісты. А ў нашай краіне іх каля 18 мільёнаў — самая вялікая армія ў свеце. Паглядзіце, колькі існуе Саветаў, міністэрстваў, ведамстваў і г. д.**

**Каму належыць уласнасць? Яна ў нас абязлічана. А капітал павінен некаму належаць. Што благога, калі прыватнік (капіталіст) мае свой надзел зямлі, сад, свой будынак, на першым паверсе якога, напрыклад, свая прыватная цырульня. Ён класна абслугоўвае кліентаў. Таму, хто чакае ў чарзе, прапаноўваюць каву, келішак сухога віна ці пачытаць газету і г. д. Ён адзін працуе, плаціць падатак. У яго няма начальнікаў з машынамі, камандзіраў з міністэрстваў. Тое ж можна казаць пра фермерскую гаспадарку. Магчыма, я крыху прымітыўна абмаляваў гэту сітуацыю, але ў прынцыпе яно так і ёсць. І яшчэ. Чалавек, які нікому не падначалены па службе, становіцца незалежным. А гэта значыць — свабодным.**

**Я. ВОЙНА,**
**в. Ст. Нягневічы.**

## „ЦВЁРДАЯ РУКА“

УСЕ мы бачым, у якім цяжкім становішчы апынулася наша краіна. Пачаўся сапраўдны эканамічны крызіс. Назіраецца параліч улады. Пахіснуўся яшчэ нядаўна моцны аўтарытэт партыі.

На фоне ўсяго гэтага ўсё часцей можна пачуць такія разважанні: «Без цвёрдай рукі парадку не будзе», «На годзік-другі нам зноў неабходны вусаты бацька...»

Слухаючы гэта, міжволі задаешся пытаннем: «Хто тут памыляецца, а хто свядома заводзіць у зман? У кім гаворыць туга прыгоннага па нагайцы, а ў кім — настальгія прыгонніка па мінуўшчыне?»

Ну, з'явіцца ў нас новы цвёрдарукі «правадыр». Дзе гарантыя, што ён пачне месці лесвіцу зверху? Што пачне адшукваць нагоду нашых бедстваў там, дзе яны сапраўды знаходзяцца? Дзе гарантыя, што не пачнецца барацьба з усімі, хто нестандартна, арыгінальна мысліць? Што не адродзіцца галоўны метад «пераканання» — рэвалюцыйнае насілле?

Абсалютна ніхто такіх гарантый даць не можа. А вопыт паказвае, што многія «цвёрдыя рукі» па локці ў крыві. Яны без сумніву, растаптаўшы законы і мараль, фабрыкавалі «справы» на мільёны нявінных ахвяр.

Паглядзіце хоць бы апошні спіс рэабілітаваных, апублікаваны ў «Звяздзе» за 16 лістапада мінулага года. Сярод ахвяр бачым рабочага, работніцу, вагаўшчыка, майстра цэха, справавода і г. д. Пра «гнілых» інтэлігентаў проста маўчу.

Вось бачыце, дзе «цвёрдая рука», наводзячы «парадак», знаходзіла «ворагаў народа» — у рабочым, сялянскім, інтэлігенцкім асяроддзі.

ДЫК дзе выхад з крызісу?

Найперш, трэба, відаць, знайсці нагоду гэтага крызісу. А яна — у адсутнасці кіраўніцтва, якое б карысталася даверам большасці народа. Нам сапраўды не шанцавала на лідэраў. На вяршыню ўлады часцей узбіраліся людзі нікчэмныя.

Гарбачова, чалавека адкрытага і, наколькі гэта магчыма палітыку, шчырага, дэмакратычнага па характару, чалавека, які не толькі можа гладка прачытаць даклад, але і асэнсаваць напісанае, які свабодна можа гаварыць наогул без усялякіх паперак, мы адразу ўспрынялі, як выратавальніка краіны. І дзеля гэтага ён, відаць, зрабіў усё, што мог. Але ці зробіць болей? Пажывём — пабачым, бо і тут гарантыі мы не маем.

З другога боку, пра сваю матэрыяльную і сацыяльную абароненасць ён паклапаціўся ў першую чаргу. А народу за пяць гадоў стала яшчэ горш. Не дзіва, што аўтарытэт прэзідэнта падае.

Апошнім часам слова «кансалідацыя» кажуць і правыя, і левыя. Але яно і сапраўды адпавядае сённяшняй сітуацыі. Трэба, каб селі за стол перамоў прадстаўнікі тых, хто «рвецца да ўлады», і тых, хто ўжо дарваўся. Ім трэба выпрацаваць механізм стварэння кіраўніцтва, якое б карысталася падтрымкай большасці народа, большасці існуючых партый і рухаў.

Такое кіраўніцтва і будзе той сапраўды цвёрдай рукой, якая дэмакратычным шляхам выведзе краіну з крызісу. Толькі гэта цвёрдасць будзе забяспечвацца не злачынствамі і тэрорам, а даверам народа. Народ жа, які давярае свайму кіраўніцтву, здольны на вялікія справы. Нават нягледзячы на часовыя цяжкасці...

**В. УЛАДЗІМІРАЎ,**
**г. Навагрудак.**

| | | | |
|---|---|---|---|
| УСПАМІНАЕ АПОШНЯЯ ШЧОРСАЎСКАЯ ГРАФІНЯ | ЦІ ЁСЦЬ У НАВАГРАДКУ ЖАБРАКІ? | КРЫВАВАЯ ВІЛЕНСКАЯ НОЧ АПОВЯД СВЕДКІ | НАВІНЫ, НАРОДНАЯ МЕДЫЦЫНА, ВЕРШЫ, АПАВЯДАННІ І ЭСЭ |

# Навагрудскі КУР'ЕР

№ 2 (3) 1991 год.



НА ЗЯМЛІ НАВАГРАДСКАЙ

Мал. А. ТАМКО

# МОВА, БАЦЬКІ, ДЗЕЦІ

ДЛЯ Беларусі, дзе дзесяткі пакаленняў выраслі ва ўмовах палітыкі паланізацыі і русіфікацыі, дыскрымінацыі беларускай мовы і культуры, адкрытага адмаўлення самога існавання беларускага народа, выключна важнае значэнне мае праблема нацыянальнай школы.

Сумнае становішча наглядна ілюструюць звесткі анкетнага апытвання бацькоў, праведзенага намі ў мінулым годзе. Кожны шосты беларус не лічыць сваю мову роднай. Толькі кожны пяты размаўляе на ёй у сям'і і кожны дзесяты — у грамадскіх месцах. Кожная трэцяя сям'я не выпісвае беларускамоўную перыёдыку, кожная другая не мае любімых перадач Беларускага тэлебачання. Крыху больш паловы апытаных упэўнены, што ім уласціва пачуццё нацыянальнага гонару. Толькі 70,4% станоўча адносяцца да дзяржаўнага статуса беларускай мовы.

Наўрад ці можна лічыць гэта нармальным, асабліва калі прааналізаваць дынаміку працэсу па звестках анкетнага даследавання, праведзенага ў 1990 годзе саветам нашай школы. На пытанні анкеты адказала 647 бацькоў і 244 вучні 7—11 класаў. Калі сярод бацькоў 84,6% беларусаў абралі сваю мову ў якасці роднай, то сярод дзяцей ужо 77,8%. Сярод вучняў на 4,9% менш тых, хто станоўча адносіцца да дзяржаўнага статуса беларускай мовы. Калі сярод бацькоў у сям'і 19,6, у сваім працоўным калектыве 14,4, у грамадскіх месцах 10,7% размаўляюць на беларускай мове, то сярод вучняў гэты паказчык вагаецца ўсяго ад 0,4 да 3,3 працэнтаў. У параўнанні з бацькамі на 10,3% менш дзяцей станоўча адносяцца да нацыянальна-культурных, на 18,1% — да сямейна-бытавых і на 13,9 — да рэлігійных традыцый свайго народа. На 17,7 працэнтаў у асяроддзі вучняў менш упэўненых у тым, што ім уласціва пачуццё нацыянальнага гонару.

НАЦЫЯНАЛЬНАЯ самасвядомасць, якая ва ўсе часы і ва ўсіх народаў разглядаецца як прагрэсіўная з'ява, у нас ад пакалення да пакалення не толькі не ўзрастае, а прыкметна паніжаецца, ведучы да своеасаблівага нацыянальнага самапрыніжэння. Нізкі ўзровень нацыянальнай самасвядомасці і культуры не можа служыць надзейным падмуркам сапраўды інтэрнацыяналісцкіх паводзін, забяспечваць неабходны ўзровень культуры міжнацыянальных зносін. Звесткі анкетнага апытвання, дарэчы, сведчаць, што толькі 62,6% бацькоў і 56,2% дзяцей свае адносіны да людзей не звязваюць з іх нацыянальнай прыналежнасцю. Ёсць сярод дзяцей і дарослых, у сярэднім 8,2%, тыя, для каго нацыянальнасць чалавека можа стаць перашкодай для сяброўскіх адносін.. Засведчана прыкметна менш станоўчых адносін апытаных і да традыцый другіх народаў. Не прыходзіцца разлічваць, што нацыянальны нігілізм аўтаматычна вядзе да інтэрнацыяналізму, хаця доўгія гады інтэрнацыяналізм у моўнай сферы разумелі менавіта як пераход з нацыянальных моў на рускую.

У наш надзвычайна дынамічны час школа не можа заставацца нязменнай. Створаная ў выніку «інтэрнацыяналізацыі» савецкая наднацыянальная школа — плоць ад плоці таталітарнай дзяржавы не можа паўнацэнна выконваць сацыяльны заказ сённяшняга грамадства, надзейна рыхтаваць чалавека да працоўнага жыцця ў складаных умовах шматнацыянальнай дзяржавы.

Ці не аб тыражаванні «бязроднасці» і «бездухоўнасці» сведчыць анкетнае апытанне? Толькі кожны трэці з апытаных свабодна валодае беларускай мовай. Толькі кожны шосты знайшоў адказ на пытанне аб найбольш значных падзеях гісторыі Беларусі ў дакастрычніцкі і кожны трэці — у савецкі час (яскравае сведчанне выніку практычнай адсутнасці самастойнага курса гісторыі рэспублікі). Кожны трэці з апытаных не змог назваць ніводнай народнай песні і танца, не ведае ні аднаго народнага свята. Толькі для кожнага другога аказалася пасільным пытанне аб славутых прадстаўніках беларускага народа, пакінуўшых прыкметны след у гісторыі, навуцы і культуры. Толькі кожны дзесяты вучань мае любімага паэта і пісьменніка, кожны шосты — любімага кампазітара, і менш аднаго працэнта — любімага мастака сярод беларускіх аўтараў. Як у люстэрку адлюстравалася аднабокая накіраванасць патрыятычна-выхаваўчай работы пры адказе на пытанне аб вядомых помніках гісторыі і культуры Беларусі: помнік Перамогі ў Мінску, Курган Славы, Хатынь, Брэсцкая крэпасць...

ЦІКАВА, што 66,3% бацькоў, 71,1% настаўнікаў і 59,4% дзяцей лічаць, што ў нацыянальным выхаванні станоўчую ролю можа іграць рэлігія, якая, як вядома, утрымлівае ў сабе аб'яднальны і прымірэнчы пачатак. Педагагічная навука павінна распрацаваць новы падыход да рэлігіі, як шматвяковай грамадскай з'явы і носьбіта культуры. Гэта пакуль дыскусійная праблема, але мы ўжо перасталі баяцца яе шкоднага і варожага ўплыву. Двойчы святары вялі гутаркі са старшакласнікамі аб дабрачыннасці і міласэрнасці. Вучні 6А і 8Б класаў правялі цікавыя экскурсіі ў адзін са старэйшых у краіне манастыроў — Жыровіцкі.

Савет школы свядома ўключыў у анкету пытанне аб тым, якой павінна быць школа. За варыянт беларускай школы выказалася 52,6% настаўнікаў, 58,1% бацькоў і 49,2% вучняў.

Год назад такую думку мела не больш трэці школьнага калектыву. Магчыма, гэта адзін з вынікаў работы па ўзмацненню нацыянальнага фактару ў навучальна-выхаваўчым працэсе, якая бярэ адлік ад святкавання 70-годдзя ўтварэння БССР. У мерапрыемствах тыдня беларускай культуры, праведзенага з нагоды юбілею, былі занятыя ўсе вучні школы, а ў свяце народных рамёстваў нават бацькі, дзяды і бабулі. Тады ж быў створаны школьны фальклорны ансамбль «Спадчына», які ў год свайго нараджэння стаў лаўрэатам абласнога агляду IV Рэспубліканскага фестывалю народнай творчасці. Зараз на яго рахунку не толькі ўдзел у шматлікіх канцэртах і святах, запіс на тэлебачанні, дабрачыннае выступленне ў доме састарэлых, але і гастрольныя паездкі ў Літву, на свята славянскіх культур у Рэспубліку Польшча.

ВЫКОНВАЮЧЫ дзяржаўныя праграмы «Родная мова» і «Спадчына», у мінулым навучальным годзе быў адкрыты першы ў горадзе беларускамоўны клас, дзе шасцігодкі разам са сваёй таленавітай настаўніцай Мазура Ларысай Анатольеўнай спасцігалі школьныя прамудрасці на роднай мове. Зараз у школе два беларускамоўныя класы — 1«А» і 2«В». Другі год працуе клас з паглыбленым вывучаннем беларускай літаратуры. Ёсць гурткі «Тваё імя», «Старонкі беларускай гісторыі», «Паэзіі дзіўны радок», факультатывы і курсы па выбару, дзе можна паглыбіць свае веды па пытаннях нацыянальнай гісторыі і культуры. Адпаведную арыентацыю маюць драматычны гурток, гурток выяўленчага мастацтва і іншыя.

Да канца задачу фарміравання нацыянальнай культуры школьнікаў, якая з'яўляецца неад'емнай часткай агульнай культуры чалавека, у стане вырашыць толькі сапраўды нацыянальная школа.

Неабходна тэрмінова вызначыць нацыянальны статус школы не толькі паводле мовы навучання і выхавання, але і паводле маральнага зместу ўсёй работы.

**Галіна ТАМКО,**
**дырэктар СШ № 4.**





Ігар
СІДАРУК

# НА ДАЛЕКАЙ ПЛАНЕЦЕ ГОН...

ФАНТАСТЫЧНАЯ ТРАГІ-ГУМАРЭСКА

МІРЫЯДЫ светлавых гадоў аддзяляюць нас ад дзіўнай планеты Гон. А дзіўнай таму, што нічога на ёй няма, акрамя пляцаў. Прычым на кожным з іх стаіць помнік Галоўнаму Паганятаму. «Хоць воку ёсць за што зачапіцца», — цешацца замілавана верныя гонаўцы, калі вецер хістае іх ударлявыя постаці...

І ляцела б спакойна ў вечнасць дзіўная планета Гон, каб не адно здарэнне. Неяк выйшлі на пляц два гонаўца і...

— Глядзі! — штурхнуў Кнот Шрота і вылупіў вочы на помнік. — Што гэта? Замест галавы — з..!
— Але, схамянуўшыся, ціха прамовіў: «Такое нешта...»

— Цішэй! — заткнуў зяпу Шрот Кноту. — А раптам так трэба? Ці мала што...

І яны кінуліся на другі, трэці, чацвёрты, трыццаць сёмы пляц... Але на кожным толькі цёрлі вочы і ціха вар'яцелі ад убачанага. Тут ім насустрач патрапіў юны гонавец з вялізарным стосам газэт «УСІМ ПРАЎДАМ ПРАЎДА!»

— Стой, падшыванец! — у адзін голас зараўлі Кнот і Шрот і, схапіўшы малога за каўнер, вырвалі з ягоных рук газэціну.

«Рашучае НЕ — паклёпу!» — заклікала перадавіца. «У апошні час найбольш несвядомыя гонаўцы сцвярджаюць, што на помніках Галоўнаму Паганятаму галава ператварылася ў... (далей ішлі кропачкі). Хлусня і варожая прапаганда! І няхай павылазяць вочы ў тых, каму гэтак здаецца!»

Прачыталі такое Кнот і Шрот і не ўтрымаліся-такі, зірнулі на помнік. І раптам — жахі сусветныя! Бы бурбалкі, пырснулі іхнія вочкі, і памеркла святло для верных гонаўцаў... А на пляцах ужо віраваў люд, і чулася толькі: пырск, пырск, пырск! І накрыла цемра далёкую планету Гон. Вось што значыць сіла друкаванага слова!

Антось
ДУБРАВЕЦ

# ДВА СТРЭЛЫ

— Стасік, страляй першы.
— Чаго я? Усё я ды я...
— Ну то ты, Дзіма!
— А-а-ай...

— Баязліўцы.

Петрык дастаў з-пад хмызоў стрэльбу. Дзеда няма — паехаў у горад. Вернецца аж пад вечар. Шукаць не кінецца. Агледзеўся: наўкола нямата. Галіны дрэў не пускаюць сюды, на могілкі, святла. Вароны прыціхлі.

Паглядзеў на помнік. На фотаздымку стары чалавек і надпіс: «Тут пахаваны Ясь Бяняш. Мы будзем помніць цябе. Дзеці, радня. 1968 г.».

Заклаў кулю. Стась з Дзімам адышлі назад.

...Разраўліся вароны. Петрык расплюшчыў вочы. Убачыў на лобе старога знак ад кулі. «Фу...» Павярнуўся да хлопцаў.

— Ну што, зайцы? Мо гілак баіцеся. Ну й як? Хай жывуць сабе людзі, а мёртвых даўно ўжо рабакі паелі. Знайшлі чаго палохацца.

Збялелыя хлапчукі нема закрычалі і кінуліся наўцёкі.

— Куды вы, — разгубіўся Петрык. — Э-эх.

Павярнуўся.

На магільнай пліце сядзеў стары. Той самы, што на фотаздымку, і паціраў лоб.

— Ой, — у хлопца падкасіліся ногі, — Ой...

— Ну чаго «ой, ой». Хто так вучыў рабіць: бацькі ці мо ў школе? — Стары ўстаў і пад нос прамармытаў. — Зрэшты і ад іх чакаць можна.

Стары ўважліва пагледзеў на сябе. Памацаў строй.

— Бач, як казаў, так і апранулі. І фотаздымак Ганулі не забыліся ўкласці. Мае то, відаць, памяць маюць. Помнік хвайны зрабілі.

Агледзеўся. Пахадзіў па моглішчы. Чулася: «І ты Вацюк, і ты Гэлька, і ты Усяслаў...»

Вярнуўся.

Стась сядзеў на зямлі і жахліва назіраў.

— Ну чаго ўсеўся. Уставай.

Дзед падняў хлопчыка. Абцерушыў.

— Што з цябе возьмеш — немаўля. І наўратці што ўцяміш, калі скажу.

Стары падыйшоў да магілы.

— А зараз за стрэльбу і ходу адсюль. Барджэй!

Спалоханы хлопец паціху ўзяў стрэльбу, павярнуўся і спачатку павольна, а пасля ўсё хутчэй пабег прэч.

Дома Стась даведаўся, што ягоная сястра нарадзіла мёртвае дзіця.

⊙

Станіслаў Пятровіч дапісаў апошні радок. Устаў, смачна пацягнуўся. Падыйшоў да вакна. Адвесіў фіранку. Вочы заплюшчыліся ад яркага святла. Расплюшчыў іх. І раптам прагучаў стрэл.

«Наваградскі кур'ер»

№ 2 (3) 1991 г.

Заснавальнік бюлетэня: рада раённага Таварыства Беларускай мовы імя Францішка Скарыны

Рэдактар
Міхась ТАЛОЧКА

Рэдакцыйная калегія:
Таіса Гурко,
Галіна Тамко,
Васіль Шэдзь

Рэдакцыя друкуе матэрыялы аўтараў, пазіцыю якіх не заўсёды падзяляе.

ПІШЫЦЕ: 231400
г. Наваградак
вул. Міцкевіча
д. 36, кв. 16
ТАЛОЧКА М. З.

Кошт 75 кап.

Наклад 3000

Наваградская ўзбуйненая друкарня
Зак. 2112